# Няхай жыве Міжнародны жаночы дзень—8 сакавіка!



Спросите вы у тишины:
Хотят ли русские войны?..

— Но,— адмоўна качаючы галавой, кажа па-іспанску Аліна.— Толькі мір.

— Не,—ціха гавораць у адказ Джэма і Марыя. Па-беларуску і па-польску рускае «нет» гучыць аднолькава,— толькі міру, толькі пакою,—і задуменна глядзяць туды, дзе іскрыцца залатымі агнямі Мінск.

І думаюць аб гэтым і ў Гаване, і ў Варшаве, і ў далёкім Буэнас-Айрасе, думаюць на ўсіх кантынентах Зямлі...

Мы не выпадкова ўпамянулі і сталіцу гераічнай Кубы, і прыгажуню-Варшаву, і горад у далёкай паўднёвай Амерыцы. Гэта родныя гарады трох дзяўчат, якіх вы бачыце на здымку. Міжнародны жаночы дзень сустракаюць дзяўчаты з розных краін свету на радзіме Міру і Шчасця, у краіне гордасці чалавецтва — Савецкім Саюзе.

Наш родны Мінск стаў цяпер родным і для шаснаццацігадовай кубінкі Аліны дэль Кармэн Марцінэс, дачкі рабочага з Гаваны. Рэвалюцыя вызваліла простых людзей палаючага вострава, яны сталі сапраўднымі гаспадарамі свайго лёсу. І Аліну паслала народная ўлада на вучобу ў Краіну Саветаў. Аліна Марцінэс стане інжынерам-электрыкам, а пакуль што яна студэнтка падрыхтоўчага факультэта БДУ імя У. І. Леніна.

Роднай стала беларуская сталіца і для былой студэнткі Варшаўскага універсітэта Марыі Чурак. Зараз Марыя вучыцца на 4 курсе філфака, вывучае рускую і беларускую філалогію. Веды, якія яна набудзе ў гасцінным Мінску, Марыя аддасць свайму народу, народу братняй Польшчы.

— А пры чым жа тут Буэнас-Айрас?— спытае чытач.

Гэты горад—радзіма Лідзіі Рачкоўскай, дачкі машыніста з Брэста. Яшчэ ў 1935 годзе выехаў Лідзін бацька з панскай Польшчы за акіян—шукаць шчасця і долі. Ды так і не знайшоў яго там ні для сябе, ні для сваіх дзяцей.

З якой радасцю, з якім хваляваннем вярталася ў 1956 годзе сям'я Барыса Рачкоўскага на бацькаўшчыну. Ехала і з нецярплівасцю чакала сустрэчы са сваёй сапраўднай Радзімай і 13-гадовая Ліда, беларуска, што нарадзілася ў Буэнас-Айрасе.

Шчасця шукай на Радзіме... Сям'я Рачкоўскага атрымала ў Брэсце ўтульную кватэру, бацька працуе машыністам крана, добра зарабляе. А Ліда цяпер вучыцца на 2 курсе матфака.

А гэтая белакурая дзяўчына? Гэта Джэма Шохан, сяброўка Марыі, Аліны і Ліды. Яна нарадзілася не за далёкімі марамі, а ў ціхім Шацку, што на Уздзеншчыне. Джэма—будучая журналістка, выдатніца вучобы. Дзяўчына ўсміхаецца—радасць нясе ёй і сяброўкам свята.

Міжнародны жаночы... У розных землях і краінах ва ўнісон б'юцца жаночыя сэрцы. Радасцю і прагай жыцця поўняцца яны і ў нашых гасцей і сябровак, для якіх наш універсітэт стаў родным домам, наша краіна — другой Радзімай, пяшчотнай і шчырай.

Са святам, дзяўчаты! Са святам, сяброўкі!

На здымку (злева направа): Джэма Шохан, Аліна Марцінэс, Лідзія Рачкоўская і Марыя Чурак.

## Сакавіцкія падарункі

*Горад спаў. А над ім*
*Маладзік угары*
*Віў сузор'яў вянкі,*
*Каб табе падарыць.*

*Ранак новага дня*
*Шоўк ружовай зары*
*Па-над Мінскам узняў,*
*Каб табе падарыць.*

*Стужкі сонцавых кос*
*Веснавое пары*
*Дзень святочны прынёс,*
*Каб табе падарыць.*

*Я таксама хачу,*
*Што магу, падарыць:*
*Маю песню пачуй,*
*Маё сэрца бяры.*

П. СУШКО.

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ЎНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 8 (478) | Чацвер, 8 сакавіка 1962 г. | Цана 1 кап.

## Шчаслівай дарогі!

*Мне трэба было напісаць аб Але Чыжэўскай. Знайшоў я яе ў хімічнай лабараторыі. Схіліўшыся над колбай, яна ўважліва сачыла за ходам рэакцыі. Даведаўшыся аб мэце прыходу, Галя нешта запісала ў свой сшытак, адклала ў бок прабіркі, хімікаты, а потым сказала:*

*— Што пра мяне пісаць? Вось лепш напішыце аб нашых дзяўчатах.*

*Ала расказала аб сабе сапраўды мала. Расла і вучылася ў Мінску. Пасля дзесяцігодкі паступіла на хімічны факультэт. Цяпер вучыцца на 5 курсе, рыхтуе дыпломную работу.*

*— Яна скромнічае,—умяшалася ў нашу размову Ліля Жарноўская.—Аб ёй можна цэлую кніжку напісаць.*

*І дзяўчаты наперабой сталі расказваць аб сваёй аднакурсніцы. Нехта прыпомніў першы курс. Пяць год таму назад разам са сваімі сяброўкамі вось у гэтай жа лабараторыі Ала рабіла першыя хімічныя доследы. Няўпэўнена адчувала тады сябе дзяўчына. Але гэта было даўно.*

*Летам яна разам са сваімі сяброўкамі паехала на цаліну ўбіраць ураджай. Вось там Алу па-сапраўднаму палюбілі дзяўчаты за яе характар. Вясёлая, жыццёрадасная, яна ніколі не давала сумаваць, дапамагала сваёй задорнай песняй.*

*— А хто актыўней за яе ўдзельнічаў у навуковым гуртку аналітычнай хіміі?—заўважыла Галя Грыгорава.—Спытайце ў Рыгора Лазаравіча Старобінца, кіраўніка гуртка. Ён вам многа раскажа пра яе.*

*Слухаў я іх і станавілася радасна на душы, радасна за гэты дружны калектыў, за дзяўчат, якія так цёпла расказваюць аб сваёй аднакурсніцы.*

*Пройдзе некалькі месяцаў, і дзяўчаты зоймуць свае месцы ў школах, у навуковых установах, сваёй працай будуць набліжаць наша светлае будучае—камунізм. Шчаслівай вам дарогі, дзяўчаты!*

М. ЯКІМЧЫК.



Вольга Леанідаўна Ніканава—ветэран нашага універсітэта. Каля 20 год працуе яна ў бібліятэцы. Зараз Вольга Леанідаўна—старшы бібліятэкар аддзела замежнай літаратуры. У аддзел паступаюць шматлікія кнігі з многіх краін свету. І неабходна ў час і дакладна даць ім належнае месца.

Вольга Леанідаўна не цураецца і грамадскай работы—яна вядзе гурток бягучай палітыкі з работніцамі пральні і прыбіральшчыцамі хімічнага корпуса.

Віншуем Вас, Вольга Леанідаўна, са святам. Жадаем поспехаў у працы, у жыцці!

Тэкст і фота Э. ДАМАРАЦКАГА.

## Слова сэрца

*Раніца. Экіпажны цэх мотавелазавода. Я ўбачыў яе каля станка апранутай у рабочую спяцоўку. У шуме, у захапленні працай яна не адразу адгукнулася на маё «Добрай раніцы». Але раптам яе вочы весела засмяяліся.*

*Тамара Новікава, цудоўная дзяўчына, якая прагна адносіцца да працы і вучобы. Яе мэта—сваім жыццём быць карыснай Савецкай дзяржаве, якая замяніла ёй бацьку і маці. Выхаванка дзіцячага дома, атрымаўшы тэхнічную адукацыю, яна ужо колькі год працуе на заводзе. Летась паступіла ва універсітэт, на вячэрняе аддзяленне журналістыкі.*

*— Я шчаслівая, што жыву ў дзяржаве, дзе маецца магчымасць працаваць, вучыцца, дзе мары людзей збываюцца заўсёды. Для мяне дзень 8 сакавіка—сапраўднае свята, якое магчыма толькі ў нас,—сказала Тамара.*

М. НІКІТКА.

## Са святам, сяброўкі!

У вылічыльным цэнтры ўніверсітэта амаль палова супрацоўнікаў—жанчыны. Яны не толькі кіруюць практыкай студэнтаў, але і вядуць навукова-даследчую работу. Так, напрыклад, Л. Сакольчык займаецца вывучэннем найлепшых варыянтаў работы Бярозаўскай ГРЭС, Е. Кавалевіч вывучае ўздзеянне параметраў на амартызацыю аўтамабіля.

У дзень 8-га сакавіка мы жадаем нашым дарагім супрацоўніцам вялікіх творчых поспехаў і шчасця.

Ф. ЧУМАКОЎ,
В. АДАМОВІЧ.



На гістарычным факультэце дацэнта Прытыцкую называюць «наша Таццяна Іванаўна».

Ніколі ў час перапынку яна не адпачывае: то гутарыць з парторгамі курсаў, кіраўнікамі палітзаняткаў, членамі рэдкалегіі насценгазеты, сакратаром камсамольскай арганізацыі факультэта.

Яе прыемны голас, мяккую ўсмешку, справядлівую патрабавальнасць ведаюць усе на факультэце. Не было выпадку, каб хто-небудзь не выканаў яе даручэння. І калі гістарычны факультэт мае поспехі ў сваёй рабоце — у гэтым нямалая заслуга партыйнага важака—Таццяны Іванаўны Прытыцкай.

У дзень 8 марта ад усёй душы хочацца пажадаць ёй яшчэ большых поспехаў.

Тэкст В. МЕЛЬЦАРА.
Фота Э. Дамарацкага і Л. Кузьміцкага.

Дзейнасць Любові Іванаўны Фіглоўскай вельмі разнастайная. На філалагічным факультэце яна чытае курс рускай савецкай літаратуры і спецкурс па творчасці выдатнага савецкага паэта У. У. Маякоўскага. Некалькі год таму назад яна паспяхова абараніла доктарскую дысертацыю і цяпер працягвае ўпарта працаваць над вывучэннем творчасці карыфея беларускай літаратуры Якуба Коласа. Не гледзячы на тое, што Любоў Іванаўна вельмі занята сваёй асноўнай работай на кафедры рускай літаратуры, загадчыцай якой яна з'яўляецца, заўсёды знаходзіць час, каб перадаць свае веды аспірантам.

У дзень свята жадаем Любові Іванаўне новых творчых поспехаў!

Тэкст Я. ЛЯХАВА.
Фота. Л. Кузьміцкага.





Лабараторыя рэдкіх і цяжкіх металаў створана ва універсітэце параўнаўча нядаўна — у мінулым годзе. Але ўжо зараз тут вядзецца цікавая навуковая работа.

НА ЗДЫМКУ: старшы інжынер лабараторыі Людміла Мікалаеўна Неакладнава праводзіць дослед.

Фота Э. Дамарацкага.

# Шчаслівая зорка

У аўдыторыі трэцякурснікаў чуваць вясёлы смех, жарты: толькі што закончылася лекцыя. Адны стаяць і спрачаюцца, відаць, наконт нявырашаных пытанняў, другія аб нечым расказваюць. Мне цяжкавата было адшукаць Марыю Гендзелеву. Смешна, але гэта так. Зусім звычайная дзяўчына, крыху сарамлівая, сярэдняга росту, яна стаяла сярод дзяўчат і аб нечым гаварыла.



Калі размова зайшла пра навукова-даследчую работу, твар дзяўчыны ажывіўся, прабегла прыемная ўсмешка. Яна ж член цэнтральнага савета СНТ. І там аб ёй адзываюцца толькі цёплым словам.

— І шчаслівая ж, ты Марыйка, і зорка твая мусіць, шчаслівая. Не тое, што я,—з нейкай зайздрасцю і ў той жа час з сардэчнай цеплынёй кажа адна з сябровак.—А чаму гэтак атрымліваецца? А, дзяўчаты?

— Ды што?

— Ну што ж, хіба не ведаеце: Марыйка ўсё можа і дамагаецца да ўсяго. Напрыклад, захацела і стала працаваць на кафедры фізіялогіі чалавека...

— А чаму б і табе не захацець,—накінуліся на яе сяброўкі.

Саромячыся, Марыя адказвае, калі я запытаўся аб яе справах:

— Нічога асаблівага я не раблю. Працую на кафедры, хаджу ў харавую капэлу. Гэтак павінны рабіць усе.

Занадта сціпла. Але колькі за кожным словам хаваецца можа нават недаспаных начэй, не надта лёгкіх часоў упартай працы над кнігай і сабою.

— У наш час мала хадзіць і слухаць лекцыі. Трэба больш працаваць над кнігамі. Я хачу сказаць аб планах на будучыню. Фізіялогія вельмі блізкая да біяфізікі, і мая мара—настойліва ўзяцца за біяфізіку.

Вельмі добрыя мары і планы! Калі слухаеш гэта, хочацца сказаць: малайчына. Вось такую не трэба запрашаць сілком ні ў навуковы гурток, ні на рэпетыцыі. Безумоўна пад шчаслівай зоркай нарадзілася Марыя.

І. ДАЎГАЛЕВІЧ,
студэнт 3 курса біяфака.

Фота Э. ДАМАРАЦКАГА
і Л. КУЗЬМІЦКАГА.

## Сатирические частушки

Шли по улице студенты,
Аспирант навстречу шёл,
— Добрый день!—ему сказали,
Он и ухом не повел.

План мы выполнить не можем
Стипендиоснятия —
Все студенты стали редко
Пропускать занятия.

Называли «Бюллетенем»
Стенгазету СНО,
Только вот по бюллетеню
«Бюллетень» живет давно.

Коридор студенты мыли
В общежитии у нас,
Тряпку в воду опустили
Всего-навсего лишь раз.

Мне должна придти газета,
Жду-пожду — ее все нету,
А газету кто-то взял
И «спасибо» не сказал.

Подготовили на вечер
Пять речей и три доклада,
Семь часов звучали речи
И концерт давать не надо.

Но оваций было мало,
Так как не было концерта,
И сидели во всем зале
Сам декан и два доцента.

П. СУШКО,
Е. КАЗЮКИН.

# СТВАРЫЦЬ НАРМАЛЬНЫЯ ЎМОВЫ ПРАЦЫ

Новы вучэбны корпус здадзен у эксплуатацыю. Значна павялічылася плошча для вучэбнай і навуковай работы. Тут займаюцца фізікі, матэматыкі і гісторыкі. Павялічылася плошча і тых факультэтаў, якія засталіся ў старых карпусах.

Да гэтага часу ўмовы работы і вучобы ў гэтых карпусах не поўнасцю адпавядаюць назначэнню плошчаў. Асабліва гэта датычыцца хімічнага корпуса. Ён аднаўляўся адразу ж пасля вайны і мае рад недахопаў, якія мяшаюць нармальнай рабоце.

Зараз гэты корпус павінен быць пераабсталяваны і больш прыстасаваны для работы хімікаў. Але пераабсталяванне не павінна зводзіцца да ўстаноўкі выцяжных шафаў, праводкі электрычнасці і вады.

Трэба правесці вялікія мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне аховы працы.

Па сённяшні дзень, хоць гэта пытанне стаяла на парадку дня некалькі год, не наладжана выцяжная сістэма, у выніку чаго ў лабараторыях скапліваюцца шкодныя пары, якія ўздзейнічаюць на прыборы, заўчасна выводзячы іх са строя.

Ад доўгага дзеяння некаторых пароў, ізаляцыйны матэрыял робіцца правадніком электрычнага току. Меліся выпадкі, калі самаўспламяняліся разеткі. Добра, што ў дзённы час. У такіх выпадках супрацоўнікі не ведаюць, што рабіць, таму што ні ў адной лабараторыі няма рубільнікаў для адключэння тэхнічнага току. Таксама немагчыма, калі патрэбна, перакрыць ваду. Водаправодныя трубы старыя, краны з-за вялікай нагрузкі і дзеяння хімікатаў псуюцца. Лабараторыю можа заліваць вада, і невядома, што ў такіх выпадках рабіць, бо слесара знайсці немагчыма.

Мясцком і адміністрацыя універсітэта кожны год састаўляюць працоўнае пагадненне, дзе фігуруюць пытанні тэхнікі бяспекі, але справа не рухаецца з месца. Працоўнае пагадненне, як правіла, больш, чым на 35—40 працэнтаў, не выконваецца. Больш пяці год на паперы будуецца хімсклад для лятучых і выбухованебяспечных рэчываў. А склада ўсё няма. У многіх лабараторыях пашкоджан ліналеум, якім пакрыта падлога, шмат сапсаваных ракавін і кранаў. А каб іх адрамантаваць, трэба вельмі доўга ўпрашваць работнікаў гаспадарчай часткі.

Да гэтага часу не знойдзена памяшканне для шкловыдзімальнай майстэрні, а ўмовы працы ў існуючай вельмі дрэнныя.

Маюць месца выпадкі, калі супрацоўнікі лабараторый самі парушаюць правілы працы. Але гэта не іх віна, а іх бяда. Яны часта не ведаюць гэтых правіл, хоць ва універсітэце ёсць інжынер па ахове працы і тэхнікі бяспекі. А. І. Ляпёшкін. Ён павінен праводзіць заняткі, семінары, але гэтага няма.

Ф. КАПУЦКІ.

**Ад рэдакцыі.** Становішча з тэхнікай бяспекі і аховай працы на хімічным факультэце яўна ненармальнае і павінна выклікаць трывогу. Друкуючы артыкул Ф. Капуцкага, рэдакцыя спадзяецца, што мясцком сумесна з адміністратыўнай часткай універсітэта абмяркуюць яго і прымуць неабходныя меры для выкаранення такога становішча.

# Першае месца не аддадзім!

**У наша жыццё надзейна ўваходзяць новыя звычкі, новыя формы выхаваўчай работы. Адна з іх — самаабслугоўванне. Яно трывала ўвайшло ў студэнцкі быт, развівае ў студэнтаў ініцыятыву і самастойнасць, прывучае да акуратнасці і парадку ва ўсім, выхоўвае адказнасць за даручаную справу, клопаты аб калектыве, аказвае дадатны ўплыў на культуру паводзін.**

Асабліва многа для забеспячэння парадку зрабілі У. Каравай— старшыня студсавета інтэрната № 4, У. Свеціч — член студсавета, А. Капусцін — старшыня студсавета інтэрната № 1, Ф. Рымша — старшыня санкамісіі і іншыя.

За поспехі, дасягнутыя ў арганізацыі самаабслугоўвання і паляпшэнні бытавых умоў і адпачынку студэнтаў, нам прысуджана грашовая прэмія ў сумме 500 рублёў і Ганаровая грамата Міністэрства асветы БССР і ЦК прафсаюзаў. Летась мы занялі першае месца ў рэспубліцы і трэцяе — у краіне.

Але дасягнутыя поспехі не павінны нас заспакойваць. Трэба стварыць яшчэ лепшыя ўмовы для адпачынку і працы студэнтаў у інтэрнатах. Некаторыя студэнты парушаюць правілы ўнутранага распарадку, мяшаюць другім адпачываць. За гэта выселены з інтэрната студэнткі V курса філфака Герасімовіч і Гусева.

Нашы студсаветы, прафсаюзны і камсамольскі актыў павінны яшчэ больш канкрэтна заняцца паводзінамі парушальнікаў дысцыпліны ў інтэрнатах.

На пашыраным пасяджэнні прафкома абмяркоўваліся гэтыя пытанні. Намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэнню ўнутранага парадку ў інтэрнатах.

Абмяркоўвалася таксама пытанне пашырэння форм самаабслугоўвання ў вучэбных карпусах. Прынята пастанова: саставіць цвёрдыя графікі ўборкі памяшканняў, прафбюро факультэтаў правесці курсавыя сходы і абмеркаваць пытанне самаабслугоўвання ў вучэбных карпусах, узяць усю мэблю і абсталяванне на сацыялістычную захаванасць, прапанаваць адміністрацыйна-гаспадарчай частцы забяспечыць групы неабходным інвентаром і спецадзеннем.

Прафком выразіў упэўненасць, што прафсаюзныя арганізацыі і факультэты прыкладуць усе намаганні к таму, каб нашы вучэбныя карпусы мелі самы прыглядны выгляд.

А. ЦАЛКО,
старшыня прафкома.

## *Выбаршчыкі выбаршчыкам*

*У агітпункце, што ў гуманітарным корпусе універсітэта, адбылася сустрэча выбаршчыкаў з паэтамі і кампазітарамі. У госці прыйшлі пісьменнік А. Я. Міронаў, маладыя паэты Г. Бураўскі, Ю. Свірка, Н. Гілевіч, кампазітар Г. Алоўнікаў.*

*Цёплая, задушэўная размова пайшла на вечары. Аб сваім жыцці расказаў А. Я. Міронаў. З захапленнем слухалі сабраўшыяся ўрывак з новай кнігі пісьменніка «Толькі мора вакол».*

*Маладыя паэты прачыталі свае новыя вершы і байкі. Добрае ўражанне пакінуў верш студэнта III курса філалагічнага факультэта Ул. Верамейчыка «Шпалы», вольныя пераводы вершаў з балгарскай мовы Н. Гілевіча.*

*У заключэнне вечара выступіў наш вядомы кампазітар Глеб Алоўнікаў.*

*Г. СПУТНІКАЎ.*

Калектыў супрацоўнікаў кафедры гісторыі КПСС выражае глыбокае спачуванне асістэнту кафедры ПРЫЛЕПКА Міхаілу Віктаравічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.

Нам. рэдактара А. ВОЛК.



Днямі універсітэт наведаў саветнік па пытаннях прамысловасці пасольства Кубы ў Маскве Энрыке Дзіас. Ён азнаёміўся з жыццём і справамі студэнтаў з гераічнай Кубы.

На здымку (злева направа): рэктар універсітэта прафесар А. Н. СЕЎЧАНКА, саветнік пасольства Кубы Э. ДЗІАС, выкладчык падрыхтоўчага факультэта П. А. МІРАНЧУК, дэкан падрыхтоўчага факультэта дацэнт І. М. ІГНАЦЕНКА.

Фота Э. Дамарацкага
і Л. Кузьміцкага.

## ДА ЎВАГІ СТУДЭНТАЎ І ВЫКЛАДЧЫКАЎ

Сёння, 8 сакавіка, адбудзецца чарговая перадача радыёвузла Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Перадача прысвечана Міжнароднаму жаночаму дню — 8 сакавіка.

Слухайце нас у 15 гадзін!

Рэдакцыя
радыёкамітэта БДУ.

Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой 212, тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва МВСС і ПА БССР. АТ 09877. Зак. 568. Т. 2000.